Падтрымай "Вясну" на PATREON

Судзілі прадстаўніка прафсаюзу РЭП Віктара Казлова, а штраф атрымаў палітык Кацора

05.04.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед



Прадстаўнік Беларускага незалежнага прафсаюзу РЭП Віктар Казлоў. Фота Радыё Свабода

У судзе Гомельскага раёну 4 красавіка разглядалася адміністрацыйная справа ў дачыненьні да рэгіянальнага прадстаўніка Беларускага незалежнага прафсаюзу РЭП **Віктара Казлова** за «дробнае хуліганства».

Як піша Радыё Свабода, амапаўцы затрымалі Казлова ўранку 25 сакавіка ў вёсцы Цярэшкавічы, калі ён выпраўляўся ехаць у Гомель, каб удзельнічаць у «Маршы недармаедаў-2». Завезьлі ў райаддзел, адтуль яго прэвэнтыўна адправілі ў ізалятар, дзе ён двое сутак правёў за кратамі. Амапаўцы ў сваіх рапартах напісалі, што, маўляў, яны 25 сакавіка ахоўвалі грамадзкі парадак, а Казлоў брыдка лаяўся на вуліцы, на заўвагі не рэагаваў, спрабаваў уцячы, хапаўся за форму.

Судзьдзя **Тамара Застаўнецкая** дапытала найперш у якасьці сьведкі мясцовага жыхара Віктара Тамашова, які размаўляў на вуліцы з Казловым, калі іх падрэзаў амапаўскі УАЗік. Казлова схапілі і запіхнулі ў машыну.

> *«Я можа два крокі зрабіў, як міліцэйская машына з Казловым ад'ехала. Такое толькі ў кіно па тэлевізары бачыў»,* — распавёў суду сьведка.

Пасля гэтага трое амапаўцаў адзін за адным пачалі распавядаць, як яны несьлі службу па ахове грамадзкага парадку ў аграгарадку Цярэшкавічы. Маўляў, ехалі па вуліцы з хуткасьцю ня больш за 20 кілямэтраў, калі пачулі, што Казлоў «гучна крычаў, лаяўся матам». Яны спыніліся, папярэджвалі, але Казлоў на заўвагі не рэагаваў. Віктар Казлоў прадставіў суду даведкі з анкалягічнага цэнтру, што яму выдалілі паўлёгкага. Ён патлумачыў, што наагул ня можа крычаць і што размаўляе ледзь ня шэптам.

Самі амапаўцы, дарэчы, называлі свае прозьвішчы надзвычай ціха, гаварылі невыразна. Многія прысутныя не маглі разабраць, пра што гаворка.

Судзьдзя Застаўнецкая рабіла заўвагі і нават выдаліла двух чалавек з судовага паседжаньня, якія прыйшлі падтрымаць Віктара Казлова. Але калі й камандзір групы Сярдзюк пачаў ледзь чутна вымаўляць сваё прозьвішча, прысутны ў зале палітык **Уладзімер Кацора** параіў: «Кажы гучней: «Паску..аў Паску..а Паску…авіч» — устаў і выйшаў з залі.


Судзьдзя Застаўнецкая абвясьціла перапынак, выйшла ў калідор і загадала міліцыянту на вахце не выпускаць Кацору. Перапыніўшы разгляд адміністрацыйнай справы пра хуліганства Віктара Казлова, судзьдзя тут жа распачала адміністрацыйны працэс у дачыненьні да Ўладзімера Кацоры за непавагу да суду. І літаральна праз тры хвіліны прагучаў вырак: штраф Кацору памерам 10 базавых велічыняў, альбо 230 рублёў.


> *«Цяпер буду ведаць, колькі каштуе сказаць у судзе праўду, — падсумаваў палітык. — Я сам ужо ня раз трапляў на такі канвэер, калі мянты самі хапаюць, самі лжэсьведчаць. Я абурыўся, выказаў такім чынам свой пратэст. Наўпрост назваў рэчы сваімі імёнамі. Беларусь Аляксандар Лукашэнка і сапраўды за цывілізаваным сьветам не вядзе».*


Што да адміністрацыйнай справы Віктара Казлова, то судзьдзя Застаўнецкая абвясьціла перапынак, каб атрымаць адказ ад органаў унутраных спраў, на падставе якога распараджэньня група АМАПаўцаў апынулася ўранку 25 сакавіка ў аграгарадку Цярэшкавічы, што за 20 кілямэтраў ад Гомеля.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

